# З чаго пачынаць — вядома

Мінуў год работы універсітэцкага прафсаюзнага камітэта, год пошукаў і знаходак, год поспехаў і, на жаль, недахопаў. 25-га кастрычніка адбылася XXIV справаздачна-выбарчая канферэнцыя. Зараз можна падвесці яе вынікі і зрабіць некаторыя вывады.

Лепш за ўсё пачаць з самой справаздачы. Даклад прафсаюзнага камітэта быў сам па сабе цікавы і змястоўны. Старшыня прафкома **Уладзімір Кеда** даволі грунтоўна, хоць часам і не вельмі крытычна, расказаў аб рабоце прафсаюзнага камітэта. Прамоўца прыводзіў лічбы, факты, называў мерапрыемствы — усё гэта ў пэўнай меры адлюстроўвала работу прафкома. І толькі адно (заведама ці не — невядома) упусціў дакладчык — расказ пра тое, як выконваліся рашэнні папярэдняй, XXIII прафсаюзнай канферэнцыі універсітэта. А пагаварыць пра гэта трэба было вельмі сур'ёзна.

Як высветлілася з выступленняў у спрэчках, прафком часам не толькі не выпраўляў старыя недахопы, але і паглыбляў іх. Вось некалькі прыкладаў. Амаль на кожнай прафсаюзнай канферэнцыі размова ідзе пра паляпшэнне жыллёва-бытавых умоў студэнтаў. Паўтарылася гэта і ў мінулым годзе. Новы прафком намеціў канкрэтныя меры па паляпшэнню быту студэнтаў, стварыў жыллёва-бытавую камісію, але як мае быць яе работу не наладзіў. Таму ў выступленні аднаго з членаў прафкома прагучала прыкладна наступнае: «Ну, працавалі, зрабілі сёе-тое». А зрабілі вельмі мала.

Не лепш справы і з камісіяй грамадскага кантролю. І смех і грэх — за цэлы год работы камісія грамадскага кантролю не правяла ніводнага рэйда праверкі. А папрацаваць было дзе. Яшчэ і цяпер не ўсё добра ў студэнцкіх сталоўках, буфетах, не ўсё добра з захаванасцю маёмасці ў аўдыторыях і інтэрнатах. Ды што казаць пра работу, калі адзін з членаў гэтай камісіі тав. Краўчанка нават на пасяджэнні прафкома не з'яўляўся.

Дрэнна працаваў культурна-масавы сектар прафкома. Ён не здолеў наладзіць добрую сувязь з культурна-масавымі сектарамі студэнцкіх саветаў, камітэта камсамола і іншых грамадскіх арганізацый. А між тым пытанне аб правядзенні студэнцкіх вечароў адпачынку ў інтэрнаце не вырашана і да гэтага часу.

Добра наладжаныя ўзаемасувязі паміж грамадскімі арганізацыямі — гэта ўмова поспеху ў іх рабоце. Такую думку выказаў кожны з выступаючых. Прафсаюзны камітэт гэтую ісціну проста пакінуў без увагі. Прычына ва ўсім адна — прафком працаваў далёка не ў поўную меру сваіх магчымасцей. Вельмі справядліва выступаючыя крытыкавалі старшыню прафкома за тое, што ён намагаўся ўсё зрабіць сам, пакідаючы ў баку ад справы членаў прафкома. А для іх было столькі работы!

Узяць хоць бы спорт. Гэта адна з важных рыс студэнцкага жыцця. Прафком не раз звяртаў увагу на спартыўную работу, але па-сапраўднаму не браўся за яе. Лічылася, што галоўнае — своечасовае фінансаванне спартыўных мерапрыемстваў. Далей гэтага справа амаль не ішла.

Прафсаюзны камітэт далёка не заўсёды вызначаўся прынцыповасцю. Справа ў тым, што часам тое, што рабілася, не даводзілася да лагічнага канца. Выявілі нейкі недахоп у рабоце — неабходна адразу ж яго выправіць. Атрымоўвалася так, напрыклад, што для вырашэння таго ці іншага пытання ў прафсаюзнага камітэта не хапала паўнамоцтваў. Вось тут бы і запрасціь на дапамогу групу садзейнічання партыйна-дзяржаўнаму кантролю. Але да гэтага не часта даходзілі рукі.

Справядліва дэлегаты канферэнцыі крытыкавалі прафком за тое, што ён не наладзіў кантроль за гаспадарчым забеспячэннем: яшчэ і дагэтуль у інтэрнатах амаль няма венікаў, шчотак, ануч для прыбірання пакояў. Здавалася б, дробязь, а абыйсціся без яе нельга.

«Быт студэнта павінен быць як мае быць», — гавораць часам. Але часта атрымоўваецца наадварот. Пасля заняткаў хочацца размяцца, расслабіцца, пагуляць, напрыклад, у валейбол. Але каля інтэрнатаў няма ніводнай пляцоўкі. Зразумела, студэнты і самі б гэта зрабілі. Але паспрабуй зрабіць гэта голымі рукамі! Увечары іншы раз нядрэнна было б патанцаваць — нельга, няма магчымасці. А чаму б прафкому не арганізоўваць часцей вечары пытанняў і адказаў, цікавыя змястоўныя лекцыі, сустрэчы з перадавікамі вытворчасці, пісьменнікамі, са знатнымі людзьмі рэспублікі. І наогул, ці не час прафкому павесці барацьбу за тое, каб цэнтрам культурна-масавай работы стаў інтэрнат?

Шмат і яшчэ якіх недахопаў у рабоце прафсаюзнага камітэта было выяўлена на канферэнцыі. І ўсе дэлегаты выказвалі адзіную думку: новы прафком, абраны на XXIV канферэнцыі, павінен выправіць недахопы ў рабоце сваіх папярэднікаў. Тым больш, што гэта думка ўсяго нашага студэнцкага калектыву.

**А. ЯРОХІН,**
**спец. кар. «Беларускага універсітэта».**

# ПРАКТЫКА... З ПРЫГОДНІЦКІМ УХІЛАМ

Прайшло ўжо два месяцы новага навучальнага года. Але дагэтуль чакаюць студэнты-вячэрнікі 2-га курса геаграфічнага факультэта, што адбудзецца сход, на якім будуць падведзены вынікі першай вучэбнай практыкі. Заўвагі па практыцы аказаліся нявыказанымі, хоць недахопаў было вельмі многа.

Першае ж уражанне ў чалавека, які апынецца ля універсітэцкай біястанцыі «Краснае Урочышча» (тут мы праходзілі практыку) такое, быццам ён знаходзіцца ля ўваходу ў біблейскі чысцец, бо дым ад гарадской звалкі, што знаходзіцца за 700—800 метраў ад яе, — не вельмі прыемная рэч. А людзям трэба тут жыць і працаваць амаль месяц.

Устаноўка палатак (вельмі падобных на рэшата) пераўтварылася для нас у падзею з прыгодніцкім ухілам, якая цягнулася амаль цэлы дзень — каштоўны дзень вучэбнай практыкі! Студэнты шнарылі па ўсіх кутках базы ў надзеі знайсці калы для ўстаноўкі палатак. Але дарэмна.

Не менш складанай праблемай аказалася і абсталяванне палатак. Стол і табурэткі з'явіліся параўнаўча хутка. А астатняе... Нашы гумарысты потым жартавалі: «На чым спалі б студэнты, калі б, не давядзі алах, згарэў стажок сена векавой даўнасці?» Пра такую роскаш, як спальны мяшок ці ложак-раскладушка, заставалася толькі марыць. Не лепш былі справы і з посудам для прыгатавання ежы.

Калі студэнты стацыянара былі забяспечаны яшчэ здавальняюча, то вячэрнікі тут аказаліся на правах «бедных сваякоў». На працягу навучальнага года мы былі забяспечаны падручнікамі горш за студэнтаў стацыянара і вымушаны былі мірыцца з гэтым. Але ў час практыкі, дзе кожная хвіліна на вагу золата, такое становішча недапушчальнае.

Нават само месца для такога віду практыкі, як геадэзічная, падабрана зусім непадыходзячае, бо ў раёне базы амаль не засталося прыроднага рэльефу. Усё навакол перакапана, перасыпана. На прыгодных 30—40 гектарах размясціць 8—10 здымачных брыгад немагчыма. Адсылаць студэнтаў для геадэзічнай здымкі на вялікія адлегласці таксама немэтазгодна, бо яны стамляюцца яшчэ да пачатку работы, ды і гарачы летні дзень таксама бярэ сваё. У выніку прадукцыйнасць працы і ўспрыйманне практыкантаў рэзка зніжаюцца.

Не лепш была арганізавана практыка і ў вячэрнікаў цяперашняга 3-га курса. Для праходжання розных відаў практыкі ім штодзённа прыходзілася выязджаць з Мінска ў розныя месцы і на розныя адлегласці, а ўвечары вяртацца назад: на стацыянарных базах універсітэта не было месц. Гэта замест таго, каб пасля працоўнага дня прывесці ў сістэму накопленыя матэрыял і падрыхтаваць яго для здачы або проста адпачыць. Я не ведаю ніводнага трэцякурсніка, які быў бы ў захапленні ад такой арганізацыі практыкі.

Ад нас, вячэрнікаў, патрабуюць ведаў у такой жа ступені, як і ад студэнтаў стацыянара, хоць набываць іх нам куды больш складана. Дык чаму ж нам яшчэ больш ускладняюць працу? Мы спадзяемся, што наша патрабаванне — стварэнне самых элементарных умоў для набыцця і замацавання ведаў — будзе выканана ў бліжэйшы час.

**С. ЗУБОВІЧ,**
**студэнт 2-га курса вячэрняга аддзялення геафака.**

## *Да Дня нараджэння камсамола*

*29 кастрычніка — Дзень нараджэння камсамола. Гэтай даце былі прысвечаны вечары студэнтаў і моладзі хімічнага, матэматычнага, біялагічнага і іншых факультэтаў універсітэта.*

# СПОРТ



*Каля пяцідзесяці ўдзельнікаў сабрала першынство універсітэта па рускіх шашках сярод першакурснікаў. Пераможцам сярод юнакоў стаў аднафамілец вядомага савецкага шашыста Барыс Бліндэр — студэнт 1-га курса матэматычнага факультэта. Сярод дзяўчат мацнейшай аказалася яго аднакурсніца Тамара Пушкарова. У камандным заліку ўсё абыйшлося без сенсацый. Як і чакалася, перамаглі студэнты матэматычнага факультэта.*

*На здымку: чэмпіёнка першых курсаў Тамара Пушкарова.*



*Сярод студэнтаў матфака вельмі папулярны веласіпедны спорт. Гэты здымак зроблены перад чарговай трэніроўкай веласіпедыстак.*

*Здымкі студэнта 4 курса матфака В. КАРЗЮКА.*

## *Састаў прафсаюзнага камітэта універсітэта*

Старшыня прафсаюзнага камітэта — **У. Рабушка** (3 курс юрфака).
Намеснік старшыні па палітыка-выхаваўчай рабоце — **П. Васючэнка** (2 курс філфака);
Намеснік старшыні па арганізацыйнай рабоце — **У. Кеда** (3 курс біяфака);
Старшыня жыллёва-бытавой камісіі — **Н. Смоляк** (3 курс гістфака).
Члены жыллёва-бытавой камісіі — **Я. Івуць** (4 курс матфака), **О. Мельнік** (3 курс геафака), **Э. Васюцёнак** (3 курс фізфака);
Адказныя за вучэбна-навуковую работу — **В. Аляхновіч** (2 курс матфака) і **В. Багель** (2 курс матфака);
Старшыня культурна-масавай камісіі — **В. Протчанка** (2 курс гістфака);
Члены культурна-масавай камісіі — **В. Увараў** (2 курс філфака) і **М. Герман** (1 курс гістфака);
Старшыня камісіі грамадскага кантролю — **А. Аўсянік** (1 курс юрфака);
Старшыня спартыўна-аздараўленчай камісіі — **В. Вялічка** (1 курс філфака);
Сакратар прафкома — **Д. Роўба** (3 курс хімфака).

* * *

Старшыня праўлення клуба універсітэта — **А. Збрыцкі** (4 курс гістфака).
Старшыня рэвізійнай камісіі — **А. Беленькі** (2 курс філфака).

## *Старшыні прафсаюзных бюро факультэтаў*

Біялагічны факультэт — **Л. Кашавараў** (3 курс);
Геаграфічны факультэт — **З. Тарлецкі** (3 курс);
Гістарычны факультэт — **Э. Новікаў** (3 курс);
Матэматычны факультэт — **Я. Грышкоў** (5 курс);
Фізічны факультэт — **М. Кучынскі** (3 курс);
Філалагічны факультэт — **Ю. Сапажкоў** (3 курс);
Хімічны факультэт — **М. Бражнікаў** (2 курс);
Юрыдычны факультэт — **В. Пыльчанка** (4 курс).


# Выпісвайце і чытайце „Чырвоную змену“

**Дарагі таварыш!**

Ці падпісаўся ты на сваю маладзёжную газету **«Чырвоная змена»?**

На старонках **«Чырвонай змены»** шырока асвятляецца жыццё і вучоба студэнтаў рэспублікі. Тут ты знойдзеш артыкулы аб праблемах вышэйшай школы, расказы аб тваіх аднакурсніках, вершы і апавяданні студэнтаў, якія спрабуюць свае сілы ў літаратурнай творчасці.

**«Брыганціна»** — так называецца спецыяльны выпуск **«Чырвонай змены»** для студэнтаў. На гэтай старонцы твае равеснікі з розных навучальных устаноў Беларусі раяцца, мараць, спрачаюцца і разважаюць аб усім, што хвалюе студэнтаў.

**ПРЫЗВАННЕ — ШТО ГЭТА ТАКОЕ?**
**ЦІ БЫВАЕ СУМНЫ ПРАДМЕТ?**
**ЯК СТАЦЬ НЬЮТОНАМ?**
**ДЫПЛОМ АБАРОНЕН. А ДАЛЕЙ?**

У абмеркаванні гэтых і іншых пытанняў ты зможаш прыняць удзел, калі зробішся чытачом і падпісчыкам **«Чырвонай змены».**

Падпісная цана: на 1 месяц — 44 кап., на 3 месяцы — 1 руб. 32 кап., на 6 месяцаў — 2 руб. 64 кап., на год — 5 руб. 28 кап.


# Ідуць лісты ў рэдакцыю

(Па пісьмах чытачоў)

Філолаг праслаў пісьмо ў рэдакцыю... Як кажуць, яму і карты ў рукі: яго зброя—слова. І нічога дзіўнага няма, што ў рэдакцыйнай пошце больш за ўсё сустракаюцца лісты, дзе стаіць адрас аўтара: «Філалагічны факультэт». Студэнты дзеляцца з рэдакцыяй, а значыць, і з усімі чытачамі нашай газеты сваімі думкамі, добрымі навінамі, выказваюць абурэнне адмоўнымі фактамі універсітэцкага жыцця.

Давайце пазнаёмімся з некаторымі з гэтых пісьмаў. Першакурснік аддзялення журналістыкі **Міхась Ціва** прыслаў карэспандэнцыю «Нам песня родная сястра», у якой ён расказвае пра работу харавога калектыву філалагічнага факультэта, пра ўдзельнікаў хору, пра іх агульнае захапленне песняй.

«Аўтобус ідзе па гораду», — так назваў свой матэрыял студэнт 2-га курса вячэрняга аддзялення журналістыкі **А. Несцяровіч.** Будучы журналіст піша пра Грушаўскі пасёлак, дзе ён жыве, пра мінулае, сучаснае і будучыню гэтага раёна Мінска, пра свае ўражанні аб беларускай сталіцы.

**Віталь Луцэнка** — студэнт аддзялення журналістыкі расказвае пра «Вясёлы дэсант» — эстрадна-канцэртную брыгаду, якая летась была створана у нас ва універсітэце. У рэдакцыйнай пошце ёсць пісьмы філолагаў, прысвечаныя лермантаўскім дням, асобным студэнтам аддзялення журналістыкі, вечарам адпачынку, што адбыліся ў некаторых акадэмічных групах і г. д. **А. Градзюшка** прыслаў невялікі літаратурны эцюд «Я здаў залік».

А вось пісьмо за подпісам **Е. Кеф.** Аўтар паведамляе, што ў інтэрнаце па Паркавай магістралі дрэнна працуе радыёвузел. Часта перапыняюцца цікавыя перадачы цэнтральнага і рэспубліканскага радыё, каб перадаць аб'явы (да таго ж не вельмі тэрміновыя) і «пракруціць» усім ужо надакучыўшыя «модныя» грампласцінкі. У той жа час цікавых перадач, падрыхтаваных студэнцкай рэдакцыйнай калегіяй інтэрната, мала. Спадзяёмся, што студэнцкі савет інтэрната па Паркавай магістралі, камуністы і камсамольцы, што жывуць тут, навядуць, нарэшце, парадак у рабоце радыёвузла. Вельмі рады, што студэнты ўзнялі гэтае важнае пытанне.

Філолагі часта пішуць у рэдакцыю. Але, на жаль, значна радзей мы атрымоўваем пісьмы ад студэнтаў іншых факультэтаў. Сапраўды, ці ж няма пра што расказаць студэнтам любога нашага факультэта? Так, ёсць. І калі ласка, сябры, не забывайцеся, што удача кожнага студэнта — гэта удача ўсяго універсітэта, што няўдача аднаго — гэта няўдача іншых. Пішыце да нас! Дзяліцеся сваімі думкамі, разважаннямі, навінамі.


**Рэдактар П. СІЛІВАНЧЫК.**

**Адрас рэдакцыі:**
г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус. 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 03789. Тыр. 2000. Зак. 3884.